тацтва і спорту, здольны дастаткова разнастайна і эфектыўна развіваць чалавечае цела. Тэатральная школа, маючы на мэце выхаванне пластычнага акцёра, накіроўвае сваю ўвагу ў асноўным на яго танцавальна-пластычную падрыхтоўку.

Танцавальная пластыка ў прафесійным навучанні драматычнага акцёра, з аднаго боку, садзейнічае набыццю «чыста» харэаграфічных навыкаў, з другога -- аказвае ўплыў на працэсы работы акцёра над сабой і над роллю, на псіхатэхніку артыста.

Танцавальная пластыка ў спектаклі з'яўляецца моцным кампанентам драматургічнага дзеяння, і пластычная мова добра навучанага акцёра можа адлюстроўваць сукупнасць знешніх праяў персанажа ва ўсёй складанасці характару, у перспектыве яго развіцця, у жанры і стылі п'есы.

Галоўная задача танцавальна-пластычнай падрыхтоўкі студэнта зводзіцца да таго, каб шляхам развіцця яго пластычных здольнасцей праз танцавальныя навыкі давесці будучага акцёра да арганічнага і творчага існавання ў танцы -- мастацтве, якое праз свае вобразныя формы паказвае ўнутраны свет чалавека, яго эмоцыі і пачуцці.

**Андрэеўская В.Д.,**
дацэнт

## СТЫМУЛЯЦЫЯ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ З ДАПАМОГАЙ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ МУЗЫКІ

Па ступені канцэнтрацыі ўвагі, памяці, мыслення -- працэсаў, якія ляжаць ў аснове разумовай працы, -- вучэбная дзейнасць з'яўляецца адной з найбольш энергаёмістых яе галін. Адпаведна канцэпцыі А.А.Ухтамскага аб дамінанце пры актывізацыі ўвагі ў кары галаўнога мозгу фарміруецца пануючы ачаг. Ён здольны ўзмацняць сваю дзейнасць за кошт імпульсаў, якія прыходзяць з іншых. аддзелаў ЦНС. Для гэтага можна прымяняць розныя раздражняльнікі, аднак найбольш яркі, стымулюючы ўплыў аказвае музыка. Пры даследаванні біяэлектрычных рэакцый галаўнога мозгу ў час яе ўспрымання адзначаецца змяненне біяэлектрычнай актыўнасці, што сведчыць аб павышэнні ўзроўню станоўчых эмоцый, а гэта таксама садзейнічае больш эфектыўнай разумовай, у тым ліку і вучэбнай, дзейнасці. У выніку ў час заняткаў на фоне ціхага гучання меладычнай прыемнай музыкі аблягчаецца як засваенне матэрыялу вучнямі і студэнтамі, так і выклад яго педагогам.

Аб павышэнні якасці разумовай працы з прымяненнем функцыянальнай музыкі сведчыць таксама карэктурная проба: яна паказвае павелічэнне аб'ёму і паляпшэнне якасці выкананай працы, асабліва пры гучанні лёгкай музыкі хуткага тэмпу, што сведчыць і аб засваенні яе рытму ў час разумовай працы.

Трэба падкрэсліць, што выкарыстанне музыкі ў вучэбнай дзейнасці садзейнічае абуджэнню інтарэсу моладзі да сваёй нацыянальнай музычнай культуры.

Методыка выкарыстання функцыянальнай музыкі простая, дзякуючы высокаму развіццю сучаснай гукаўзнаўляючай тэхнікі. Неабходна толькі, каб апаратура забяспечвала найлепшую якасць гучання і працавала безадмоўна.

Вынікі апытання студэнтаў сведчаць, што найбольш успрымальнай з'яўляецца музыка меладычная, ціхая, роўная па ўзроўню гучнасці. У скарбніцы сусветнай музычнай культуры можна знайсці шмат неабходных яе ўзораў.

**Чабатаронак А.А.,**
ст.выкладчык

## ПРАБЛЕМА ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЯНАЛІЗМУ ШЛЯХАМ ВЫКАРЫСТАННЯ ТВОРЧЫХ ЗАДАННЯЎ

Развіццё прафесіяналізму выпускніка факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання -- вынік выхавання і самавыхавання студэнта, тэмп, дынаміка і характар якіх у значнай ступені залежаць ад творчага багацця асобы педагога, які працуе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ